**МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

вул. Калектарная, 10, 220004, г. Мінск
Тэл./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

**МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

ул. Коллекторная, 10, 220004, г. Минск
Тел./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

05.10.2010 № 06-14/1431

На № ____________

Рада Грамадскага аб'яднання
"Краёвае згуртаванне літвінаў"

Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь разгледжаны матэрыялы аб дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага аб'яднання "Краёвае Згуртаванне Літвінаў" ( далей - ГА "Краёвае Згуртаванне Літвінаў").

Заява і іншыя дакументы аб дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання паступілі ў Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь 02.09.2010 г. Пры іх вывучэнні быў установлены шэраг парушэнняў норм заканадаўства.

У адпаведнасці з часткай восьмай артыкула 10 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях" (далей-Закон) кіруючыя і кантрольна-рэвізійныя органы грамадскага аб'яднання з'яўляюцца выбарнымі органамі. У выбарныя органы грамадскага аб'яднання могуць быць абраны толькі члены гэтага аб'яднання.

Згодна пункта 5.3. Статута ГА "Краевае Згуртаванне Літвінаў" Рада і Рэвізійная камісія абіраюцца З'ездам з ліку членаў аб'яднання.

У адпаведнасці с пунктам 10 Інструкцыі аб парадку афармлення і разгляду дакументаў, звязаных с дзяржаўнай рэгістрацыяй палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, іх саюзаў (асацыяцый), а таксама дзяржаўнай рэгістрацыяй і выключэннем з журналу дзяржаўнай рэгістрацыі, пастаноўкай на улік і зняццем з уліку іх арганізацыйных структур, зацверджанай Пастановай Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад.30.08.2005 № 48 ( далей Інструкцыя), абявазковымі пытаннямі павесткі дня ўстаноўчага сходу грамадскага аб'яднання з'яўляюцца:

- аб стварэнні і зацвярджэнні назвы аб'яднання;
- аб зацвярджэнні статута аб'яднання;
- аб членстве заснавальнікаў ( прозвішча, імя, імя па бацьку).

- аб выбарах кіруючага, кантрольна рэвізійнага, а таксама іншіх цэнтральных органаў аб'яднання, прадугледжаных яго статутам;
- аб надзяленні не менш як трох членаў кіруючага органа аб'яднання паўнамоцтвамі прадстаўляць інтарэсы аб'яднання ў рэгістрыруючым органе альбо судзе.

Пры вывучэнні пратаколу Устаноўчага З'езду ГА "Краёвае Згуртаванне Літвінаў" ад 2 жніўня 2010 года ўстаноўлена, што пытанне аб членстве заснавальнікаў было разгледжана пасля таго, як ужо былі абраны кіруючыя і контрольна рэвізійныя органы. У парушэнне вышэй памяненага артыкула Закона, Інструкцыі і асабістага статута, кіруючыя і кантрольна - рэвізійныя органы былі абраны з грамадзян, якія на момант іх выбрання не з'яўляліся членамі аб'яднання.

Такім чынам, заснавальнікамі ўпамянутага грамадскага аб'яднання парушаны ўстаноўлены парадак стварэння грамадскага аб'яднання, і гэта парушэнне мае неустаранімы характар.

Акрамя таго, вызначаныя абзацам чацвертым пункта 4.3. статута аб'яднання ўмовы правамоцнасці рашэнняў органаў аб'яднання, згодна якім рашэнні прымаюцца большасцю галасоў якія прісутнічалі на пасяджэнні, а не членаў аб'яднання, не адпавядаюць прынцыпу самастойнасці, замацаванаму ў артыкуле 4 Закона.

На падставе выкладзенага, кіруючыся абзацамі другім і трэцім часткі трэцяй артыкула 15 Закона, пастановай Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 01.10.2010. № 68 адмоўлена ў дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага аб'яднання "Краёвае Згуртаванне Літвінаў".

Начальнік упраўленя
грамадскіх аб'яднанняў А.О. Кірычэнка

06 Зінкевіч 200 61 95
Адм. Літвіны